арганізаваныя і праведзеныя з акадэмічнага пункту гледжання, апрача высвятлення рэальнага стану рэчаў могуць і спрыяць стварэнню пазітыўнага іміджу ўстановы і наладжванню камунікацыі, з чаго Запаведнік і скарыстаўся. Што, у сваю чаргу, пазітыўна паўплывала на стасункі мясцовай супольнасці і Запаведніка і на арганізацыю дзейнасці грамадскага камітэту: "Праводзячы работу па вяртанню абліччу горада «свайго твару», запаведнік не мог абысці праблему назваў вуліц у гістарычнай частцы. Супрацоўнікамі запаведніка было праведзенае апытанне жыхароў. Па яго выніках было прынятае рашэнне гарвыканкама аб змене назваў вуліц: «Вялікай» і «Замкавай» зараз зноў называецца колішняя «Луначарскага», а «Камсамольская» зноў стала «Рынкавай»" [2, с. 62]. Больш затое, менавіта дзякуючы намаганням камітэту жыхароў захавалася гістарычная трасіроўка гэтых вуліц пры пракладанні газаправоду.

*Такім чынам*, нельга сказаць, што партыцыпатыўная культура – штосьці невядомая ў практыках айчынных музеяў. З іншага боку, нельга не адзначыць, што з канца 1990-х і асабліва ў 2000–2010-я гг. назіраўся крызіс партыцыпатыўных практык – крызіс і арганізацыйна-метадалагічны, і экзістэнцыйны. Калі звярнуцца да досведу работы таго ж Запаведніка, то можна канстатаваць, што ў пэўны перыяд асабліва моцна тэндэнцыя да адраджэння элементаў традыцыйнай культуры выявілася праз удзел мясцовых жыхароў у арганізацыі і правядзенні культурна-масавых мерапрыемстваў – ад этнаграфічных абрадаў і рытуалаў да пленэраў сучаснага мастацтва. На жаль, большасць з такіх мерапрыемства зараз ужо праходзіць без удзелу саміх жыхароў – ім аддаецца роля выключна гледача-назіральніка. Менавіта тут і маглі б прыйсці на дапамогу сучасныя метадалагічныя падыходы ў партыцыпатыўнасці і скіраванасць ў экспазіцыйнай і культурна-адукацыйнай рабоце да лакальнага кантэксту.

Трэба прызнаць, што на сёння немагчыма не толькі паўтарыць ранейшы поспех лакальнай музейнай партыцыпацыі з ранейшай жа метадалогіяй. Аднак спалучэнне колішніх дасягненняў і новыя метадалагічныя падыходы маглі б даць плён.


1. Гаранская, Т. Прапановы па стварэнню запаведніка "Заслаўе": Заслаўе на Меншчыне (1989) / Т. Гаранская // Навуковы архіў ДУ "Гісторыка-культурны музей-запаведнік "Заслаўе" (НА ГКМЗЗ).
2. Калбаска, А.М. Музейны дыярыуш ці Уваходзіны ў новую музеялогію/ А.М.Калбаска. – Мінск : БелІПК, 1999. – 148 с.
3. Канцэпцыя развіцця Гісторыка-культурнага запаведніка "Заслаўе" (1989) // НА ГКМЗЗ.
4. Саймон, Н. Партиципаторный музей / Н. Саймон ; пер. А.Глебовской. – М. : Ад Маргинем Пресс, 2017. – 368 с.



**Сімакоў А.В.**


## МУЗЕІ І ТЭМЫ: ВОПЫТ ПЕРАПІСКІ ІНДЗЕЯНІСТАЎ ГОМЕЛЯ З МУЗЕЯМІ


*Ключавыя словы:* музеязнаўства, індзеяністыка, карэспандэнцыя, калекцыі, Гомель, класіфікацыя, персаналіі.


Частай тэмай у размовах гомельскіх індзеяністаў была ідэя стварыць уласны музей, публічны цэнтр – індзейскі музей, музей Чэ Гевары або Лацінаамерыканскі цэнтр. Індзеяністы-аматары звычайна маюць тую ці іншую колькасць "прадметаў музейнага значэння" – мадэлі і імітацыі матэрыяльнай культуры, плакаты, буклеты, значкі, маркі і г.д. (яркая атрыбутыка, несумненна, прыцягвае наведвальнікаў, але падтрыманне такога самадзейнага "пункта ўвагі" ў еўрапейскіх краінах ажыццяўляецца пераважна ў выглядзе "індзейскіх вёсак"

за гарадам (у Беларусі – пакуль адзінкавыя "спрошчаныя" камерцыйныя спробы); "Музей індзейца" і "Музей індзейцаў" былі блізкія да пачатку рэалізацыі на практыцы ў Глускім раёне і Сокале каля мінскага аэрапорта). Адначасова вялася перапіска з музеямі розных краін (найбольш Беларусі, Расіі і ЗША) па пытаннях даследавання беларуска-індзейскіх сувязей (БІС). Музеі і бібліятэкі былі сярод першых, стандартных адрасатаў, якім накіроўваліся нашы запыты ў рамках распрацоўкі тэм.

Найпрасцейшая класіфікацыя музеяў заснаваная на тэмах нашых зваротаў да іх (некаторыя структуры з музейнымі калекцыямі не мелі слова "музей" у назве, былі "змешанага" тыпу або музейнымі "аддзеламі"):

1) М. Грынкевіч [2], яго радзіма в. Рэпкі Рагачоўскага раёна, яго сваякі і калегі: Амурскі абласны краязнаўчы музей імя Р. С. Новікава-Даурскага (Д. Грынкевіч), Арэнбургскі губернатарскі гісторыка-краязнаўчы музей, Горацкі раённы гісторыка-этнаграфічны музей (Ф. Грынкевіч), Гродзенскі дзяржаўны гісторыка-археалагічны музей, Музей гісторыі горада Арэнбурга, Музей гісторыі і культуры яўрэяў Беларусі (пераклад на ідыш і іўрыт нататкі "Пра школу"), Музей гісторыі расійскага кадэцтва, Рагачоўскі музей народнай славы, Ровенскі абласны краязнаўчы музей (А. Мартыш), Тульскі абласны краязнаўчы музей, Цэнтральны музей старажытнарускай культуры і мастацтва імя Андрэя Рублёва (епіскап Уладзімір (Сакалоўскі)), Чарнігаўскі абласны гістарычны музей імя В. В. Тарноўскага (ігумен Георгій (Чудноўскі));

2) руселезнаўства, якое цесна звязанае з тэмай М. Грынкевіча: Дзяржаўны музей гісторыі рэлігіі (Санкт-Пецярбург), Магілёўскі абласны краязнаўчы музей, Сахалінскі абласны краязнаўчы музей, Смітсаніянскі інстытут і інш.;

3) аляксазнаўства, у асноўным тэма беларусаў на Алясцы або ў сувязі з ёй (апошняе – М. Грынкевіч і М. Русель): Ахоцкі краязнаўчы музей імя Я. Ф. Марокава (Саўчанкі, Кацельнікавы), Іркуцкі дзяржаўны аб'яднаны музей (Літвінцавы – іркуцкая сям'я купцоў і святароў), Калужскі абласны краязнаўчы музей (мясцовая мяшчанская сям'я Карсакоўскіх – з якой адкрывальнік на Алясцы), Карэльскі дзяржаўны краязнаўчы музей (У. Сладкевіч – аўтар кнігі пра Рускую Амерыку), Краснінскі краязнаўчы музей (Саўчанкі), Курскі дзяржаўны музей археалогіі, Літаратурны музей Максіма Багдановіча (П. Шадура), Музей алуціік і Музей Баранава (у Кадзьяку) (Саўчанкі);

4) езуітыка, беларускія езуіты ў краінах Амерыкі: Даўгаўпілскі краязнаўчы і мастацкі музей і Музей місій (Санту-Анжэлу, Рыу-Грандзі-ду-Сул) (А. Экарт); Маздокскі краязнаўчы музей (І. Анры, І. Вароніч, Я. Войшвіла);

5) БІС праз літаратурнае краязнаўства: Гудзевіцкі дзяржаўны літаратурна-краязнаўчы музей (А. Карпюк і К. Кавальчук), Дзяржаўны літаратурны музей Янкі Купалы, Лепельскі раённы краязнаўчы музей (У. Міхно), Музей Янкі Маўра (Бытчанская 8-гадовая школа), Музей Янкі Маўра (СШ № 126 г. Мінска), школьны музей в. Мясата Маладзечанскага р-на (А. Тышынскі);

6) БІС праз артэфакты, прамыя кантакты ў музеях: Дзяржаўны музей гісторыі і этнаграфіі Літвы (Вільнюс) (індзейскія рэчы ў калекцыях Радзівілаў [1] і ў гэтым музеі), Музей афрыканска-амерыканскай гісторыі Дзюсабль (В. Смірноў і С. Паўлаў);

7) Эмігрантыка, беларуская дыяспара: Брэсцкі абласны краязнаўчы музей (у сувязі з месцам нараджэння мастака Л. Рыбака [4]), Капыльскі раённы краязнаўчы музей (капыльскія выхадцы ў Су-Сіці), Крычаўскі краязнаўчы музей (М. Русель, А. Галынскі, У. Бонч-Бруевіч, М. Крываносаў), Мазырскі краязнаўчы

музей (М. Анціповіч, ідэнтыфікацыя – мазырскі аўтар і / або эмігрант у Мексіцы), Музей рускай культуры (Сан-Францыска), Музей таоскага мастацтва (мастакі з Беларусі ў Нью-Мексіка і Арызоне), Навагрудскі гісторыка-краязнаўчы музей (І. Дамейка, пытанне перакладу "Араўканіі і яе жыхароў" – музей быў гатовы перакласці з польскай), НДІ і музей антрапалогіі МДУ (антраполагі Я. Рагінскі з Магілёва, І. Сіленіч з Крычава), Рослаўльскі гісторыка-мастацкі музей (С. Сакалоўскі), Чукоцкі акругові краязнаўчы музей (М. Мандрыкаў; абмен матэрыялам для вырабаў), Этнаграфічны музей (Торунь) (М. Пецюкевіч), Яўрэйскі музей Амерыканскага Захаду;

8) індзейскія музеі або музеі індзейцаў: Араваксі музей (Кінгстан, Ямайка) (у т.л. беларусы на Ямайцы), Музей індзейскай культуры (Гістарычнае таварыства лені-лепапэ), Музей індзейца (Манаўс), Музей індзейцаў іракезаў (Скахары), Музей індзейцаў паўднёвых раўнін, Музей народа анейда (Вісконсін);

9) высвятленне магчымых беларускіх каранёў: Драгобыцкі краязнаўчы музей, Львоўскі дзяржаўны рэспубліканскі гістарычны музей, Стрыйскі дзяржаўны краязнаўчы музей (усе запыты звязаныя з Агрызкамі), Цяльшайскі краязнаўчы музей (А. Мазановіч);

10) пошук кантактаў і карэспандэнтаў: Антрапалагічны музей Мантанэ (факультэт біялогіі Гаванскага ўніверсітэта) (запыт па кубінскіх індзейцах), Гістарычны музей Форт-Уачука (спецыялісты па Паўднёвым Захадзе, асабліва апачах), Музей Амерыкі (Мадрыд) (у т.л. Трохгоддзе Выгодскіх);

11) захаванне (перадача) калекцый, лічбавых матэрыялаў: Беларуская бібліятэка і музей імя Францішка Скарыны, Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва, Веткаўскі музей стараабраднiцтва і беларускіх традыцый, Гісторыка-культурны музей-запаведнік "Заслаўе", Гомельскі музей ваеннай славы, Гомельскі палацава-паркавы ансамбль (раней Гомельскі абласны краязнаўчы музей), Музей аўтографа (Гомельская цэнтральная бібліятэка імя А. І. Герцэна), Музей друку і фатаграфіі (Гомель) (пытанне захавання перыёдыкі), Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь;

12) навуковыя канферэнцыі: Віцебскі абласны краязнаўчы музей, Гродзенскі дзяржаўны музей гісторыі рэлігіі, Музей гісторыі Магілёва [2], Філіял "Чырвоны Бераг" Жлобінскага гісторыка-краязнаўчага музея і інш.

Па розных пытаннях мы пісьмова звярталіся і ў іншыя музеі, сярод іх Баранавіцкі краязнаўчы музей, Біялагічны музей Брэсцкага дзяржаўнага педагагічнага інстытута, Мемарыяльны дом "Сальвадор Альендэ" (Гавана), Музей малой бацькаўшчыны ў Студзіводах (Падляшша), Музей-лабараторыя Ф. Скарыны Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта, Хойніцкі краязнаўчы музей.

Даволі значныя абмены (падрыхтоўка публікацый [5], бягучая бібліяграфія, працяглая бясплатная падпіска на часопіс, "агульныя і розныя пытанні") былі з К. Феестам з Этнаграфічнага (перайменаваны ў Сусветны) музея ў Вене.

Прыкладам нашых кароткіх і ў той жа час ёмкіх пытанняў можа служыць ліст у Нацыянальны музей у Варшаве: "Станіславу Лорэнцу або яго калегам" (№ 7 12.01.1990):

"Шаноўныя панове,

Мы адважваемся звярнуцца да Вас з просьбай даць кароткія даведкі па двух пытаннях:

1. Ці вядома Вам штосьці пра лёс этнаграфічных калекцый Радзівілаў з Нясвіжа – магчымае цяперашняе месцазнаходжанне індзейскіх прадметаў, а таксама іканаграфіі з амерыканскімі сюжэтамі?

2. Ці былі прадстаўлены артэфакты з Амерыкі ў калекцыях Вашага музея ў перыяд кіраўніцтва ім Ю. Карніцкім і Ц. Ляхніцкім?

Будзем Вам надзвычай удзячныя за адказ.

Нашы сардэчныя пажаданні поспехаў у вашай дзейнасці.

З павагай

Алесь Сімакоў

часовы выканаўчы сакратар [Беларуска-індзейскага таварыства]" (пераклад з рускай мовы; С. Лорэнц памёр праз год і два месяцы – тэарэтычна можна лічыць, што ён мог даведацца пра гэты ліст).

Наяўнасць і атрыбуцыя індзейскіх прадметаў у музеях СССР абмяркоўваліся з А. Вашчанкам, Г. Дзеніскевіч [3] і інш.

Нас цікавілі месцы ў Беларусі, дзе ёсць або магчымая папулярызацыя індзейскіх рэалій і гісторыі індзеяністыкі, а таксама навуковых дысцыплін, якія найбольш блізкія да яе – як гісторыя першабытнага грамадства. З гэтай мэтай мы звярнуліся і ў Музей БДУ; яго загадчык адказаў (на бланку БДУ, але без даты і нумара, мінскі штэмпель – 21.10.1991; папраўкі арфаграфіі):

"Выканаўчаму сакратару БІТ [...].

Паважаны тав. Сімакоў, на Ваш ліст ад 12.10.1991 магу паведаміць наступнае. Наш музей пачаў працаваць у 1929 годзе як музей гісторыі першабытнай культуры і рэлігіі. Ён быў састаўлены з гіпсавых злепкаў, зробленых ленінградскімі мастацкімі майстэрнямі з арыгіналаў, што знаходзіліся галоўным чынам у Эрмітажы і ленінградскім Этнаграфічным музеі. З пачатку ў ім былі прадстаўлены Егіпет, Асіра-Вавілон, першабытная культура (каменны, бронзавы векі), а таксама будызм, ламанізм і інш.

На жаль, у час Вайны, усе матэрыялы загінулі, і паведаміць што-небудзь больш канкрэтнае зараз немагчыма.

З павагай. Заг. Музея А. Плавінскі".

Абмен на арыгінальную тэму злачынства беларуса ў Рускай Амерыцы адбыўся 24.01.2019 г.: Э. Стэфіян з Музея алуціік паведаміла пра сляды, якія засталіся ад прамысловай арцелі на востраве Укамак (Чырыкава), якой кіраваў В. Саўчанка.

Мастацтвазнавец і супрацоўнік музея ў Таосе (Нью-Мексіка) Д. Уіт дастаў інфармацыю пра Л. Рыбака і Л. Гаспара – пакеты з ксеракопіямі [4], кнігамі, газетамі і інш. З Нью-Мексіка ж мы атрымалі (ад Т. Гульёта, 9.06.2005) і пасылку з дакументамі пра наданне ступені ганаровага доктара ўніверсітэта А. Цеханавецкаму (спонсар выдання пра калекцыі Радзівілаў [1]) і артэфактамі, якія маюць "музейнае значэнне" ў Беларусі.

У Лацінскай Амерыцы, хаця тут першы музей з этнаграфічнымі калекцыямі ў катэгорыі "створаны ўраджэнцам Беларусі" (І. Дамейкам), мы маем невялікую колькасць музейнай перапіскі; вынік быў бы лепш, калі б мы цалкам скарысталіся спісам індзейскіх музеяў, дасланым Бразільскім камітэтам ICOM (ліст яго старшыні Л. М. Марцінс ду Рэгу Наваэс (Рыа-дэ-Жанейра) ад17.09.1991).

Мы налічваем каля сотні асоб, якія мелі працяглы вопыт з музеяміі / або ў час нашых пісьмовых абменаў працавалі ў іх; найперш прыгадваюцца тым ці іншым важкім або адметным укладам у нашы пошукі і пачынанні: У. Валодзін, Г. Варонава, А. Гульбэ (Даўгаўпілс), К. Джохансен, Г. Дзеніскевіч [3], А. Дрыдза,

Г. Запартыка, А. Зорын, І. Пушкін [2], В. Кавалік (Торунь), С. Каспрыцкі, Р. Кінжалаў, С. Корсун, А. Кузняцова, Г. Кузьміч, У. Латышаў, А. Ляшковіч, І. Машкала, М. Мельнікаў, Н. Міхасёва, К. Мэсінджэр (Пенсільванія), М. Мяняйленка, А. Панеях, Ю. Патлань, А. Санчэс Гарыда, М. Станюковіч, Т. Сулежыская (Варшава) [1], К. Усовіч, Дж. Фадэн (іракезкі мастак), В. Шубін (ураджэнец Мінска на Сахаліне).


1. Высоцкая, Н. [автор предисловия, публикация]. Инвентарь XVII в. коллекции радзивилловских портретов, опубликованный Т. Сулежиской в 1962 г. / Н. Высоцкая[автор предисловия, публикация] // Нясвіжскія зборы Радзівілаў : іх фарміраванне, гістарычны лёс, цяперашняе месцазнаходжанне і шляхі выкарыстання / рэдкал.: А. Мальдзіс (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларускі фонд культуры, 2002. – С. 101–124.
2. Сімакоў, А. В. Протаіерэй Мікалай Грынкевіч : фармулярны спіс 1907 г. і іншыя крыніцы пра службу ў Сан-Францыска, Чыкага, Арэнбургу, Бялёве і Ташкенце / А. В. Сімакоў // Гісторыя Магілёва : мінулае і сучаснасць : зборнік навуковых артыкулаў удзельнікаў XIII Міжнар. навук. канф., Магілёў, 28–29 чэрвеня 2023 г. / уклад. І. А. Пушкін. – Мінск : ІВЦ Мінфіна, 2023. – С. 321–329.
3. Dzeniskevitch, G. I. La collection tlingite dans le Musée d'Anthropologie et d'Ethnographie de l'Académie des Sciences de l'URSS / G. I. Dzeniskevitch // Pre-Columbian collections in European museums / ed. A.-M. Hocquenghem, P. Tamási, Ch. Villaine-Gandossi. – Budapest : Akadémiai Kiadó, 1987. – P. 181–190.
4. Rand, H. Louis Ribak / H. Rand // Louis Ribak : the late paintings. [Exhibition] January 8th to April 8th, 1984. Roswell Museum and Art Center, Roswell, New Mexico. – [1984]. – P. 15–31.
5. Simakou, A. Indian trail across Belarus / A. Simakou // European Review of Native American Studies. – 1993. – № 1. – P. 65.



**Соколова О.М.**


## КУЛЬТУРНОЕ НАСЛЕДИЕ В ПРОСТРАНСТВЕ ОТКРЫТОГО ГОРОДА: ОБНОВЛЕНИЕ СТРАТЕГИЙ СОХРАНЕНИЯ И ПОПУЛЯРИЗАЦИИ


*Ключевые слова:* культурное наследие, городское пространство, открытый город, гуманизация городской среды, социальная активизация.


Современные концепции реконструкции городской среды в числе основных задач определяют сохранение и популяризацию культурного наследия. Культурное наследие участвует в процессе градостроительного развития, формировании архитектурно-художественного облика города, выступает составляющей его бренда, влияет на обновление территории.

В характеристике современного города, развивающегося в контексте гуманизации городской среды (идеи которой отсылают к концепту «право на город», предложенному Анри Лефевром в 1960-е гг. [8], а также концепции «город для людей», разрабатываемой Яном Гейлом в 2000–2013 гг. [3]), одной из базовых черт является его открытость.

В первоначальном значении понятие «открытый город» подразумевало объявление города необороняемым, что запрещало нападение на него во время военных действий с целью защиты исторических достопримечательностей.

В актуальных исследованиях городского пространства идея открытости получает иную интерпретацию.

По мысли Ричарда Флориды, автора теории креативного класса, открытый город – это город, предназначенный для всех категорий горожан, разных социальных групп. «Открытость – уровень терпимости к различным группам населения, их принятия…» [7, с. 163], «…толерантность и принятие разнообразия в местном обществе» [7, с. 175], – отмечает исследователь. Открытость, по его мнению, прежде всего связана с ценностью индивидуального самовыражения. Р. Флорида ссылается на данные, полученные Рональдом Инглхартом, опросы кото-